Упраўленне адукацыі Лідскага раённага выканаўчага камітэту
Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Яслі-сад  № 24 г.Ліда"

# Выкарыстанне магчымасцей онлайн-зносін ва ўмовах двухмоўя для арганізацыі эфектыўнага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу: блог "Беларуская хатка"

Ярашэвіч Алена Віктараўна,
загадчык дзяржаўнай установы
адукацыі"Яслі-сад  № 24 г.Ліда"
https://belaryskaiahata.blogspot.com

2019

Кожны высокаадукаваны чалавек павінен ведаць традыцыі і мову свайго народа. Таму трэба ўсвядоміць, што чым больш нацыянальнага ў выхаванні, тым мацнейшая, духоўна багацейшая нацыя.

За час работы ўстановы дашкольнай адукацыі быў накоплены багаты матэрыял па далучэнню выхаванцаў да культуры свайго народа. Для таго, каб працэс знаёмства з беларускай культурай быў максімальна інфарматыўны і набліжаны да сучаснага грамадства, было вырашана стварыць віртуальны этнаграфічны пакой, тым самым павялічыць цікавасць і якасць далучэння выхаванцаў і бацькоў да культуры нашага народа.

Намі была рэалізавана ідэя стварэння віртуальнага этнаграфічнага пакоя ўстановы дашкольнай адукацыі пад назвай “Беларуская хатка”.

Падчас распрацоўкі блога мы паставілі мэту, якая была накіравана на сістэматызацыю і папулярызацыю вопыта работы ўстановы дашкольнай адукацыі па пытаннях патрыятычнага выхавання сродкамі стварэння віртуальнага пакоя.

Дзейнасць блога накіравана на рэалізацыю наступных задач:

- вызначыць накірункі дзейнасці віртуальнага этнаграфічнага пакоя;
- стварыць віртуальны пакой практыкаарыентаванай накіраванасці з магчымасцю пастаяннага яго папаўнення і развіцця;
- аформіць матэрыял у максімальна зручным выглядзе для выкарыстання ў рабоце;
- садзейнічаць выхаванню ў дзіцяці любові да роднага краю.

Блог створаны на платформе «blogger.com». Прэзентаваны ў красавіку 2017 года ў час правядзення раённага Дня адчыненых дзвярэй для выхавальнікаў дашкольнай адукацыі па тэме “Павышэнне прафесійнага майстэрства педагогаў ва ўмовах работы раённага рэсурснага цэнтра па патрыятычнаму выхаванню”. У час правядзення раённага этапа конкурсу “Камп’ютар. Адукацыя. Інтэрнэт” блог “Беларуская хатка” быў узнагароджаны дыпломам I ступені.

На галоўнай старонцы блога можна пазнаёміцца з актуальнымі навінамі і падзеямі нашай установы адукацыі па пытаннях патрыятычнага выхавання.

Галоўная старонка блога змяшчае наступныя раздзелы:

- “Аб этнаграфічным пакоі”;
- “Накірункі дзейнасці”;
- “Літаратурная спадчына”;
- “Беларускія народныя гульні”;
- “Каляндар народных свят і абрадаў”;
- “Тыдзень беларускай культуры”;
- “Мой горад Ліда”;
- “Дзіцячае ручное ткацтва”;
- “Каляндар народнай лялькі”;

- “Часопісы для бацькоў.

Раздзел “Аб этнаграфічным пакоі” віртуальна знаёміць выхаванцаў і дарослых з міні-музеем установы дашкольнай адукацыі. Дадзены раздзел спрыяе развіццю дзіцяці і садзейнічае яго пазнавальнай актыўнасці, прывівае любоў да традыцый народа, далучае да нацыянальнай культуры, выхоўвае эстэтычны густ.

Такі раздзел, як “Накірункі дзейнасці” змяшчае падраздзелы:

- “Культура і побыт нашых продкаў”;
- “Правядзенне народных свят і абрадаў”;
- “Беларускае нацыянальнае адзенне”;
- “Сакральны свет беларусаў (абрадавыя лялькі, беларускія лялькі-абярэгі)”;
- “Правядзенне майстар-класаў”.

У такіх падраздзелах, як “Культура і побыт нашых продкаў”, “Беларускае адзенне” можна з лёгкасцю знайсці любы экспанат нашага пакоя і атрымаць кароткія звесткі аб ім.

Падраздзел “Правядзенне народных свят і абрадаў” змяшчае інфармацыю аб фальклорных святах года: гісторыі ўзнікнення свята, традыцыях, а таксама практычны матэрыял. Гэта дазваляе педагогам вельмі хутка знайсці неабходны матэрыял. У падраздзеле “Сакральны свет беларусаў” сабрана калекцыя абрадавых лялек і лялек-абярэгаў.

На старонках блога можна знайсці аўтарскія майстар-класы па стварэнню лялек, фотаздымкі з майстар-класаў, якія праходзілі ў нашай установе дашкольнай адукацыі з педагогамі раёна, бацькамі.

Такім чынам, выкарыстоўваючы ў рабоце з выхаванцамі матэрыялы раздзела “Накірункі дзейнасці”, педагагічныя супрацоўнікі ўзбагачаюць не толькі свае веды, але і далучаюць выхаванцаў да вытокаў народнай спадчыны, садзейнічаюць пашырэнню не толькі актыўнага маўлення дзяцей, але і фарміруюць элементарнае ўсведамленне моўнай і маўленчай рэчаіснасці.

Найбольш змястоўным раздзелам блога з’яўляецца раздзел “Літаратурная спадчына”, які ўключае падраздзелы:

- “Беларускія пісьменнікі дзецям”;
- “Творы мастацкай літаратуры і фальклора для дзяцей”.

Тут змешчаны біяграфічныя звесткі аб класіках дзіцячай літаратуры з вылучанымі асобна творамі, якія рэкамендаваны вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, а таксама поўны спіс беларускіх твораў мастацкай літаратуры і фальклора для дзяцей згодна вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Гэта дазваляе вельмі хутка знайсці неабходны твор і быць упэўненым, што ён адпавядае ўзросту дзяцей, фарміруе культуру ўспрымання гэтых твораў, садзейнічае далейшаму практычнаму авалоданню мастацка-маўленчай дзейнасцю.

У раздзеле “Беларускія народныя гульні” прадстаўлена картатэка беларускіх народных гульняў рознай рухомасці. Для зручнасці гульні размешчаны ў алфавітным

парадку. Кожная гульня змяшчае назву, мэту і падрабязнае апісанне, што вельмі карысна пры планаванні работы. Выкарыстанне матэрыялаў дадзенага раздзела спрыяе не толькі развіццю рухаў і фізічных якасцей, але і фарміраванню ў выхаванцаў дыялагічнага маўлення пры ажыццяўленні сумеснай дзейнасці, ініцыятыўнасці зносін, умення весці гутарку.

Раздзел “Каляндар народных свят і абрадаў” змяшчае пералік фальклорных святаў, падзеленых па сезонах, кожнае свята мае падрабязнае апісанне, падабраны гульні, вершы, прыказкі, прымаўкі да кожанага свята, што дазваляе педагогам больш змястоўна пазнаёміць выхаванцаў з надыходзячымі святамі, узбагаціць змест гутарак з дзецьмі тэмамі пра фальклорныя святы і абрады беларускага народа.

У нашай установе дашкольнай адукацыі  кожны апошні тыдзень месяца плануецца як Тыдзень беларускай культуры. Кожны тыдзень мае сваю тэму. Так зусім нядаўна ў нашай установе дашкольнай адукацыі прайшоў тыдзень “Бабульчын куфэрак”.  Больш падрабязна пазнаёміцца, як праходзяць гэтыя тыдні, можна ў раздзеле “Тыдзень беларускай культуры”.

Наступны раздзел прысвечаны малой радзіме “Мой горад Ліда”. Гэты раздзел уяўляе сабой міні-блог, дзе змешчана карысная інфармацыя аб горадзе Ліда, яго гісторыі, гісторыка-культурнай спадчыне, культурных мясцінах, помніках Лідчыны, гарадскіх скульптурах. Мясціны, якія наведалі нашы выхаванцы, можна ўбачыць на фотаздымках дзіцячых экскурсій па горадзе. Дадзены раздзел дапамагае выхоўваць патрыятычныя пачуцці, узбагачае слоўнік выхаванцаў на аснове паглыблення ведаў пра родны горад, развівае ўменне дзяцей выкарыстоўваць у маўленні разважанні, тлумачэнні.

Раздзел блога “Дзіцячае ручное ткацтва” дапамагае не толькі педагогам адукацыйных паслуг, але і выхавальнікам дашкольных устаноў, бацькам знайсці практычныя парады па вырабу работ,  убачыць вынікі дзіцячай працы.

Такім чынам, вынікам нашай работы з’яўляецца створаны блог, практычны матэрыял якога паспяхова выкарыстоўваецца ў рабоце педагогаў з выхаванцамі, дазваляе выкарыстоўваць магчымасць онлайн – гутаркі ва ўмовах білінгвізма. У будучым мы плануем далей працаваць над блогам, дзяліцца вопытам работы, папаўняць практычным матэрыялам, павялічваць колькасць экспанатаў нашага віртуальнага пакоя.

Калі ласка, у нашу хату!